Дэмаграфічная бяспека

## Нараджаюць на Міншчыне ўсё часцей

**Дзяцей на Міншчыне за леташнія адзінаццаць месяцаў нарадзілася на 6,7 працэнта больш, чым за такі ж тэрмін у 2005-м. Усяго 13 373 новыя грамадзяніны Беларусі з'явіліся на свет у цэнтральнай вобласці.**

Стала менш выпадкаў смяротнасці сярод дзяцей ва ўзросце да аднаго года — з 6,8 да 5,3 на тысячу нованароджаных. Амаль ва ўсіх рэгіёнах Мінскай вобласці, за выключэннем пяці раёнаў, дзяцей з'яўляецца на свет, у параўнанні з мінулымі гадамі, усё больш.

І невыпадкова — дабрабыт людзей з'яўляецца галоўнай мэтай дзяржаўнай дзейнасці. Таму абласныя выдаткі менавіта на сацыяльную сферу складаюць большую частку бюджэту, і павялічваюцца, згодна з планам, на пяць працэнтаў кожны год. Моладзь зацікаўлена ў тым, каб ствараць сям'ю і нараджаць дзяцей. У кожным раёне вобласці распрацавана праграма па прадастаўленню жылля маладым сем'ям, у сельскай мясцовасці і горадзе ўжо «працуюць» праекты па вырашэнню пытанняў з чаргой на жыллё, ільготнымі крэдытамі і г.д. А шматдзетным сем'ям, у якіх выхоўваюць трое і больш дзяцей, гарантаваны дом ці кватэра.

Акрамя таго, у вобласці паніжаецца і агульны паказчык смяротнасці сярод насельніцтва. Як паведамілі карэспандэнту газеты ў Мінскім аблвыканкаме, колькасць людзей, якія пайшлі з жыцця, за адзінаццаць месяцаў мінулага года панізілася на 2,5 працэнта і склала каля 22 тысяч чалавек. Разам з тым, пакуль захоўваецца тэндэнцыя перабольшвання смяротнасці над нараджальнасцю на восем з паловай тысяч чалавек (гэта 1,6 працэнта).

Нагадаем, што па даных на 1 снежня мінулага года на Міншчыне пражывае 1 мільён 467 тысяч 500 чалавек.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

Хто каго?

# «ЯК МАШЫНА СТАНЕ КОЛАМ: НІ ЎПЕРАД НІ НАЗАД — ВЫ НЕ ПОЎЗАЙЦЕ НАЎКОЛА, А...»




**Добра той дзень пачынаўся — чытачка пазваніла. Спытала: «Дык што вы там самі сабе думаеце? Мужыкоў пад машынай кінулі і што — хай прападаюць? Грэх жа!»**

**Каемся: грэх і насамрэч! Бо, папершае, колькі тых мужыкоў... «на дарозе валяецца» — раз, два і болей няма. Астатніх — падабралі даўно...**

**Кабета адна, чулі, у хлебны пайшла, бачыць — мужчынка ля прыступак ляжыць. Думае: «А ён нішто сабе... Дадому прывесці, абмыць — да раніцы, глядзіш, праспіцца і жыць можна будзе...» Рашыла ўжо: хлеба вазьму, буду назад ісці і... Купіла, выходзіць — а таго мужчыны і след прастыў — нямашака: можа, сам устаў, можа, апярэдзіў хто і падняў...**

**Карацей, паглядзела кабета на тое месца, дзе толькі што быў і сама пра сябе падумала: «Во дурніца я, во дурніца — паўгода хлеба не ела ці што?».**

**Яшчэ адна быль. З канверта ўжо. Аўтатраса, значыць. Аварыя. Ды такая, што Божа барані: машына, бедная, ушчэнт разбіта. Але ж пасажыры ўсе — муж, жонка, дзеці, — жывыя-здаровыя, як быццам. Цешча толькі... Ці не розумам кранулася — ходзіць вакол таго, што машынай было, у ладкі пляскае і прыгаворвае: «Слава Богу, Слава Богу! І мы ўсе жывыя, і ён... жанчын благіх катаць не будзе».**

Зрэшты, гэта так — блізка да пазначанай тэмы, але ж не тое. Тое — нашы чытачы выдаюць — у рамках прывычнага ўжо конкурсу на лепшы подпіс да здымка і (па завядзёнцы) — вершамі. А таму — уступ... Першы. Ад жонкі і мужа Астроўскіх з Мінска:

*Беларус наш*
*з плённай працы*
*Стаў пакрыху абжывацца*
*І «жалезнага каня»*
*Ён сядлае спакваля...*
*З год гайсае вершнікóм,*
*А на дрýгі — **пад** канём.*

Уступ другі (на галашэнне нечым падобны. — **Аўт.**) ад сп. Ульянавай з Нясвіжа:

*За мяжой купіў аўто,*
*ды зусім не новае*
*Аддаў баксаў за яго*
*тысяч сем. З паловаю...*
*З форсам ехаў ён дамоў,*
*думаў, пашыкуе*
*Яно ж стала тут калом —*
*Месяц рамантуе.*

Доўга... У прафесіяналаў гэтай справы, атрымалася б, канешне, хутчэй. Але ім — плаціць трэба. А дзе грошыкі браць?.. Няма адказу. Ёсць — горкае прызнанне ад сп. Дубовіка з в. Арэшкавічы Бярэзінскага раёна:

*Ох, і рады былі з Надзяй,*
*Як купілі гэту «Аўдзі»!*
*Ліха толькі — легкавушка*
*Смокча грошы, як цялушка.*

На што? Канкрэтна... Ды ці вам казаць?

*Усё жыццё сваё «струбіў» —*
*Іншаземны «Форд» купіў...*
*Недахоп — толькі адзін:*
*Вельмі любіць «Форд» бензін,* — зазначае сп. Федарака са Скідаля.

Пра другі артыкул расходаў піша сп. Чыгрынава з в. Забалацце Вілейскага раёна:

*Колькі шыку, колькі бляску —*
*Не машына, проста казка!*
*Год паездзіў — і не рад,*
*Бо не пройдзе тэхагляд.*

Пра трэці (артыкул расходаў) — узгадвае сп. Дубовік:

*Не зайздрошчу я кіроўцам,*
*Хоць заўзяты іх кліент:*
*То іх цягнуць на вяроўцы,*
*То штрафуе нейкі «мент».*

Дадайце да гэтага расходы на гараж, стаянку, запчасткі... гарэлку. Прычым тут яна? Ну, як жа:

*У любой машыне штось*
*Паламацца можа.*
*Як бутэлька ў цябе ёсць, —*
*Ой як дапаможа!* —

дзеліцца вопытам сп. Астроўскі.

Але ж расходы расходамі, а найгорш, што ад паломак тых нервы гарáць, у чалавека — знешні выгляд псуецца:

*Каб не думаў пра машыну,*
*Не нажыў бы ён маршчынаў.*

І ногі б здаравейшыя былі:

*Як сэрвіс стаў не па кішэні,*
*Скрывавіш, брат, **свае** калені...*

Сп. Вінаградаў з Бабруйска ім, праўда, больш вартае месца знайшоў:

*На каленях ля машынак*
*Нашы хлопцы ўсё часцей...*
*Каб вось гэтак ля жанчынак,*
*Больш было б у нас дзяцей!*

Высакародная мэта! Дзеля яе... Чаго толькі не зрабіў бы!

*Тут — сістэма бі-бі-сі:*
*Метр едзеш — два «нясі».*
*Дык, мо, хлопцы гэта «...МО»*
*Здаць пара ў металалом?* —

ставіць пытанне сп. Федарака.

І мае ж рацыю. Асабліва, калі ведаць, якое расчараванне перажыла адна маладзічка! Пра яе (ці за яе... Яна — дагэтуль плача) сп. Астроўскія пішуць:

*Купіў мілы «Мерседэс»*
*І завёз мяне ў лес.*
*А ў лесе — й не абняў...*
*«Мерседэс» рамантаваў!*

Ну гэта ўжо зусім... Не па-мужчынску — не лагічна, не разумна. Разумней было б (Юрый Вінаградаў піша):

*Як машына стане колам:*
*Ні ўперад, ні назад —*
*Вы не поўзайце наўкола,*
*А каленам ёй... Пад зад.*

Уявілі? Біць — не раім. А пад чым, як кажуць, і падпісаліся б, дык перад мудрымі радкамі сп. Гудачковай з Жыткавічаў:

*Каб вось гэтак не ляжаць*
*(Чытачам для смеху),*
*«...МО» дай Бог рамантаваць*
***Перад** тым, як ехаць.*

І дай Бог — па добрай дарозе... А то —

*Справа — лужа, злева — яма,*
*І не ўздумай ехаць прама —*
*Там бугор, бы ў горле костка...*
*Не язда, пакута проста!*
*І за гэтыя «рагаткі»*
*З нас, браткі, бяруць падаткі.*

Плацім... Нікуды не дзенемся, калі... грошы знойдзем. Гэтыя ж мужыкі (па меркаванню сп. Гудачковай):

*Сёмы раз паўзуць пад «тачкай» —*
*Не знайшлі, пакуль, заначку!*

Бяда...

А значыць, чыстую праўду піша сп. Дзмітрава з Гомеля:

*Далікатная ў нас тэма:*
*Ёсць машына —*
*ёсць праблема.*
*З ёй змагайся, упірайся,*
*Як ля жонкі, завіхайся,*
*Бо без клопату і ўмення*
*Будуць бедныя калені.*

Але закончыць гэты агляд хацелася б нечым больш аптымістычным. Таму:

*Хай бяжыць, бяжыць дарога...*
*Не гаруйма, брат, нідзе,*
*Бо адзін шафёр другога,*
*Не пакіне ў бядзе!*

Дай Бог! Удачы вам. У дарозе. І на новым этапе конкурсу (здымак, як вы зразумелі, дадаецца). А вось што датычыцца старога (там, калі помніце, мужчына ў баразне ляжаў, бульбу ў кашы «скрыжоўваў», ці дзяліў...), то лепшыя радкі пра яго (па меркаванню вялікага чытацкага журы) прапанавалі Вальдэмара Шышко і Валерый Гаўрыш з Пастаўшчыны, Любоў Чыгрынава з Вілейшчыны, Яўгенія Шыбут з Капыльшчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў і Уладзімір Лясун з в. Каменны Барок. З чым не магло не пагадзіцца малое рэдакцыйнае журы. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую (сэрцам) «родную газету на роднай мове» на другі квартал 2007 года накіроўваецца на Бярэзіншчыну.

Усім астатнім (апроч падзякі) не лішні напамін: калі ласка, пішыце коратка (па ўмовах конкурсу — не больш за 8 радкоў), не лянуйцеся перачытаць і паправіць. А галоўнае — думаць. Над тым, што чуеце і бачыце. У тым ліку — на конкурсным здымку.

**Валянціна ДОЎНАР.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Тыя, што нас берагуць

# БЕРАЖЫ ВАС БОГ І ПОЛЫМЯ СВЕЧКІ!

***(Працяг. Пачатак у нумары за 2 лютага.)***

### «Грамніца»

Звычайна свечкі-**грамніцы** людзі рыхтавалі загадзя. Тыя, хто трымаў пчол, выплаўлялі самыя вялікія свечкі, у каго іх не было — куплялі жоўты воск у краме або ў знаёмых пчаляроў. М.Я. Нікіфароўскі адзначаў, што грамнічныя свечкі былі «такога памеру, які дазваляў бы схаваць яе на грудзях пад верхняй вопраткай або ў рукаве і такім чынам утаіць ад чужых прысутнасць свечкі». Ён жа адзначаў, што свечка, памеры якой карацей за пяць вяршкоў (22 см) і таўшчынёй менш за мезены палец, не лічылася «грамніцай» і не магла надзейна засцерагчы яе ўладальнікаў. Найбольш тыповыя памеры былі наступныя: даўжыня павінна быць прыкладна 10 вяршкоў (44 см), а таўшчыня — тры чвэрці вяршка (каля 3,5 см). Такія памеры былі абумоўлены практычкай гаспадарчай дзейнасці і той колькасцю абрадавых сітуацый, у якіх грамнічная свечка выступала ключавым атрыбутам.

Сёння хіба толькі пчаляры здольны зрабіць сапраўдную свечку-грамніцу адпаведных памераў. Часцей за ўсё свечкі купляюць у храмах, аднак у сувязі з тым, што яны значна меншых памераў, то іх раяць браць тры і пераязваць «васьмёркай» пасмачкай вычасанага лёну.

З моманту асвячэння (заканчэння спецыяльнага абрадавага дзеяння, усходам Сонца) у храме і правядзення адпаведнага рытуалу дома той ці іншы святочны атрыбут пераўтвараўся ў сакральную рэч, якая, з аднаго боку, магла па-рознаму спрыяць чалавеку, сям'і, гаспадарцы, а з другога — станавілася аб'ектам празмерных дамаганняў людзей, звязаных з чорнай магіяй. Напрыклад, перавяслы, якімі звязалі рукі і ногі нябожчыку, спрыялі лячэнню захворванняў суставаў тых жа рук і ног. Аднак іх магічнае выкарыстанне ў начны час магло прывесці да розных бедаў у сям'і памёршага. Якраз таму знаўцы тайных ведаў раілі: сямейны абярэг таксама трэба сцерагчы, каб ён не патрапіў у чужыя рукі. Да ліку сакральных атрыбутаў адносілася і грамнічная свечка. На працягу года яе захоўвалі ў чырвоным куце за абразамі або ў куфэрку, у якім з правага боку была спецыяльная палічка або збітая з дзвюх дошак скрынка, дзе захоўваліся нажніцы, катушкі нітак, напарстак, паперы (дакументы), бабуліны пацеркі і іншыя сямейныя рэліквіі. Існавала павер'е: каб злыя духі не ўкралі гаючую і засцерагальную моц «грамніцы», яе трэба было трымаць далей ад чужых вачэй, каб ніхто не ведаў, дзе яна схавана, і нават не здагадваўся, што яна ёсць у хаце.

### Выкананне рытуальных дзеянняў у дзень святкавання Грамніц

Неабходна адзначыць, што «грамніца» была ўніверсальнай абрадавай рэччу, яна выконвала ролю абярэга, амулета і нават талісмана.

- Пасля вяртання дадому гаспадар неадкладна даставаў свечку, жонка запальвала яе і адбываўся незвычайны, але абавязковы абрад агністага крыжавання. Спачатку бацька абпальваў крыжападобна валасы на сваёй галаве, потым жонцы і ўсім астатнім членам сям'і па ўзросту. Па чарзе, пачынаючы ад старэйшых, да яго падыходзілі ўсе члены сям'і і судакраналіся з полымем, тым самым быццам бы далучаючыся да жыццядайнага нябеснага агню, які знішчае ў чалавеку ўсю брыдоту.
- Пасля «вогненнага асвячэння» ўсіх дамачадцаў бацька ў суправаджэнні дзяцей абыходзіў усе куты хаты, зноў-такі крыжападобна выпальваючы нячыстую сілу. Знакам такога «выпальвання» былі чорныя крыжы, якія заставаліся на бэльках або дзвярах.
- Затым ён выходзіў у двор і выконваў той жа самы абрад ва ўсіх гаспадарчых пабудовах, за выключэннем лазні.
- Акрамя гэтага, у некаторых рэгіёнах выконвалі наступнае рытуальнае дзеянне: у хлеў неслі грамнічную свечку і ламалі-разразалі яе на столькі частак, колькі жывёлін там было. Такое дзеянне надзейна захоўвала хатнюю жывёлу ад сурокаў.

Дбайныя гаспадыні не абміналі такое вялікае свята для выканання асобных рытуальна-магічных дзеянняў, скіраваных на паляпшэнне дабрабыту і перасцярогу дамачадцаў:

- Курам давалі больш аўса, каб яны лепш несліся, а яйкі былі больш смачнымі. Прыказка сведчыла: «Кармі курэй аўсом — вясной і летам будзеш з яйцом».
- Вярнуўшыся дадому пасля вячэрняга набажэнства, гаспадар трос садовыя дрэвы, каб яны далі багаты ўраджай пладоў.
- Традыцыя забараняла ў гэты дзень адпраўляцца ў далёкую дарогу. Напрошваецца прамая аналогія з Калядамі, калі ў першы вечар пажадана было ўсім сядзець за сямейным сталом. Праз кароткі прамежак часу пачнецца Вялікі пост, таму лічылася абавязковым сем раз паесці ў гэты дзень.
- Старыя людзі раілі: «Грамнічная свечка не падлягае пазычанню, як і агонь, нават у блізкія дамы сваякоў, родных асоб, што жывуць у іншай сям'і».
- У дзень Грамніц у храмах асвячалі не толькі свечкі, але і ваду. Па ступені значнасці грамнічная вада лічылася на адным узроўні з той, якую бралі на Вадохрышча. Ваду даволі часта выкарыстоўвалі адначасова са свечкай. Калі хлопец ішоў служыць у войска, то маці з бацькам акраплялі яго на выхадзе з хаты свянцонай вадой і ўголас гаварылі наступныя словы: «Божухна, захавай цябе».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

***(Працяг будзе.)***

Анталогія беларускай песні

# ОЙ, ГОРА-БЯДА

***СЛОВЫ Зіновія ПРЫГОДЗІЧА***
***МУЗЫКА Алега ЧЫРКУНА***

*Усё мне нялюба, усё мне няміла,*
*Каханая зноў*
*пра спатканне забыла,*
*Сяджу адзінокі пад сумнай вярбой,*
*І сэрца спавіта панурай журбой.*

***Прыпеў:***

*Ой, гора мне, гора, ой, гора-бяда.*
*Душу ледзяніць, як з крыніцы вада.*
*Ой, гора мне, гора, ой, гора-бяда.*
*Дзе ружы цвілі, парасла лебяда.*

*Прапала спатканне,*
*загублены вечар.*
*Ці будзе яшчэ*
*ў нас з табою сустрэча?*
*Бо той, хто кахае, той не забывае,*
*А хто забывае — хіба ж ён кахае.*

***Прыпеў.***

*Схілілася долу*
*вярба над крыніцай,*
*А мне, падкажы,*
*да каго прыхіліцца?*
*Каму расказаць пра пакуты мае,*
*Што сэрца баліць і жыцця не дае.*

***Прыпеў.***

*А мо ў тым загадка*
*натуры жаночай —*
*Рабіць не заўсёды,*
*што сэрцайка хоча.*
*Навошта загадкі тут, не разумею,*
*Ды крыўды таксама*
*трымаць не ўмею.*

***Прыпеў.***

У 2004 годзе рэпертуар ансамбля народнай музыкі «Свята» папоўніўся новай лірычнай песняй «Ой, гора-бяда», якую напісалі Зіновій Прыгодзіч і Алег Чыркун. Салісты-вакалісты Вячаслаў Статкевіч і Святлана Байдак разам з калектывам стварылі запамінальны музычна-сцэнічны абразок, які ўдала перадае і характар песні, і душэўныя перажыванні закаханага хлопца.

Мастацка-вобразнымі сродкамі песня «Ой, гора-бяда» блізкая да фальклорных твораў, таму вельмі ўсхвалявана ўспрымаецца слухачамі. Пра гэта і паведаміла Святлана Шаўцова, удзельніца мастацкай самадзейнасці аграгарадка «Пальмінка» Гарадоцкага раёна, калі звярнулася з просьбай надрукаваць тэкст і ноты песні. Ёй вельмі падабаецца ансамбль «Свята», беларускія песні ў яго выкананні. І яна жадае ўсім спяваць беларускія народныя і аўтарскія лірычныя творы і актыўна прапагандаваць іх.

**Міхась ШАВЫРКІН.**




Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Стральцам — быць упэўненымі ў сабе, а Рыбам — пазбягаць дыктатарскіх замашак

**АВЕН**. У вас будзе выбар: узяць адпачынак ці рэалізаваць творчыя планы. Кардынальныя і ў той жа час пазітыўныя перамены ў жыцці будуць залежаць ад умення належным чынам паказаць свае здольнасці. У пачатку тыдня максімум, што вы зможаце, — гэта падтрымліваць свае справы на належным узроўні і аператыўна дзейнічаць пры крайняй неабходнасці. Але, пачынаючы з серады, удача будзе плыць вам у рукі: галоўнае — не ленавацца.

**ЦЯЛЕЦ**. Работа ды работа, але ж гэты тыдзень — час вашага росквіту. Ну што ж, давядзецца расходаваць яго на працоўныя подзвігі. Вам будзе спадарожнічаць удача ў важных знаёмствах, сустрэчах і паездках. Людзі, якія ўвойдуць у ваша жыццё на гэтым тыдні, прапануюць свежыя ідэі і адкрыюць новыя перспектывы. Ваш аўтарытэт значна ўмацуецца, што створыць аснову для станоўчых змяненняў у службовым ці грамадскім становішчы. Гэты тыдзень абяцае быць на рэдкасць выніковым і шчодрым на прыемныя сюрпрызы. У панядзелак неабходна адстаяць свае цудоўныя ідэі. У аўторак будзьце больш уважлівыя да таго, што вы гаворыце ці збіраецеся сказаць. Небывалы творчы парыў можа ахапіць вас у пятніцу — і ўсё бліскуча атрымаецца.

**БЛІЗНЯТЫ**. Пачынаецца спрыяльная паласа. З'явіцца шанц для прасоўвання па службовай лесвіцы. Могуць узнікнуць новыя планы, перспектывы, ідэі. Зразумела, палепшыцца і настрой. Вас чакаюць прыемныя падзеі ў асабістым жыцці і ўвага процілеглага полу. У пятніцу магчыма павышаная чуллівасць і ранімасць, так што ўзмоцненыя сацыяльныя кантакты могуць прывесці як да станоўчых, так і да адмоўных эмацыянальных рэакцый.

**РАК**. У вас ёсць шанц завесці каштоўныя знаёмствы. Гэтаму будзе спрыяць ваш дар красамоўнасці і ўменне ўпэўніваць навакольных. У панядзелак не працуйце вельмі многа — дайце адпачынак розуму і целу. На рабоце давядзецца разлічваць толькі на асабістыя сілы і магчымасці. Калі адчуваеце, што стаміліся ад сустрэч і вам не хочацца зносіцца з людзьмі, — значыць, пара ў адпачынак, аднаўляць сілы і энергію. Вялікая верагоднасць з'яўлення шматлікіх зманлівых прапаноў. Пастарайцеся выбраць самыя лепшыя з іх. У суботу, калі абставіны дазваляюць, устройце сабе прыемны вечар.

**ЛЕЎ**. Асцярожнасць вам не зашкодзіць, бо можаце трапіць у заблытаную сітуацыю. У панядзелак можна разлічваць на дапамогу блізкіх людзей. Вы адчуеце прыліў сіл, якія неабходна прымяніць у стваральных мэтах. Успомніце пра свой дом, паклапаціцеся пра яго добраўпарадкаванне і ўтульнасць. Калі вас папросяць аб дапамозе, пастарайцеся не адмаўляць. Займіцеся самаадукацыяй і павышэннем прафесійнага ўзроўню. Выхадныя дні давядзецца прысвяціць разграбанню бытавых праблем, якія назапасіліся.

**ДЗЕВА**. Вам пажадана засяродзіцца на самых важных у дадзены момант справах. Абставіны могуць садзейнічаць таму, што вам давядзецца выбіраць, і гэты выбар будзе жыццёва неабходным. Давядзецца адстойваць свае інтарэсы ў адносінах з партнёрамі. Рэальна разлічвайце свае сілы: на рабоце пастарайцеся вырашаць толькі тыя праблемы, якія маюць да вас непасрэднае дачыненне. У аўторак пастарайцеся пазбягаць канфліктаў і авантур, яны могуць выклікаць страты. Субота — цудоўны дзень для рэалізацыі творчых планаў. Найбольш спрыяльным для вас днём на гэтым тыдні будзе пятніца.

**ШАЛІ**. Вы, як заўсёды (ну, амаль заўсёды), будзеце поўныя сіл і энергіі і гатовыя зрабіць адразу тысячу спраў, як ніколі абаяльныя і прывабныя. Удача, нібы залатая рыбка, плыве да вас у рукі, астатняе ж — у вашых сілах і магчымасцях. Дабіцца таго, чаго жадаеце, будзе значна прасцей, калі думаць на крок наперад. Пара ўзяць водпуск і добра адпачыць. Удалымі будуць паездкі за мяжу ці за горад. Вам неабходны спакой і адасабленне ў выхадныя. Агарадзіце сябе ад непатрэбных сустрэч.

**СКАРПІЁН**. Гэты тыдзень — час для ўмацавання ўнутранага стрыжня. Адчуеце сілу, якая дазволіць вам брацца за справы, якія раней выклікалі няўпэўненасць, быць больш гаварлівымі і разняволенымі ў любой сітуацыі. У аўторак зможаце выпадкова знайсці інфармацыю, якая была ўтоена, але вельмі важная для вас, якую можна і трэба выкарыстоўваць у сваіх мэтах. Серада — дзень, які не падыходзіць для прыняцця адказных рашэнняў, таму не варта прызначаць у гэты дзень дзелавых сустрэч. У нядзелю вы зможаце атрымаць доўгачаканы адказ на пытанне, якое даўно хвалюе: усё акажацца значна прасцей, чым вы ўяўлялі.

**СТРАЛЕЦ**. Не распыляйце каштоўныя сілы па дробязях. Будзьце ўпэўнены ў сабе: залішняя крытыка ўласных дзеянняў будзе зараз зусім не дарэчы. Раптоўна адчуеце, што ўнутрана крыху змяніліся. Магчыма, з-за гэтага вам стане сумна. Але ва ўсім ёсць свае светлыя бакі — у вас з'явіцца доўгачаканая магчымасць змяніць кола зносінаў. На панядзелак смела плануйце самыя розныя справы — ваш энергетычны патэнцыял будзе на вельмі высокім узроўні. У аўторак будзьце больш асцярожныя пры зносінах з калегамі па працы, уважліва правярайце інфармацыю, якая паступае, бо верагодны недакладнасці. У чацвер парадуюць пазітыўныя падзеі, якія неяк незаўважна прасачыліся ў ваша жыццё. Субота добра падыходзіць для нефармальных сустрэч. Вялікая верагоднасць таго, што большую частку гэтага дня давядзецца прысвяціць штодзённым справам. Нядзелю лепш правесці ў адасабленні і прысвяціць адпачынку.

**КАЗЯРОГ**. Удалы тыдзень для абнаўлення гардэроба. Асаблівых поспехаў на працы пакуль не прадбачыцца, затое творчы патэнцыял паступова пачне павышацца. У аўторак пажадана пазбягаць непатрэбных і малапрыемных сустрэч, інакш да канца тыдня можаце адчуць упадак сіл. Не старайцеся ахапіць неабдымнае, аб'ектыўна разлічвайце сілы ў сераду. Нядрэнна праверыць некаторых дзелавых партнёраў на надзейнасць. У пятніцу не выключана сутыкненне з бюракратычнай валакітай. Вольны ад іншых заняткаў час варта прысвяціць вывучэнню літаратуры па прафесіі. У суботу не варта пачынаць новыя справы.

**ВАДАЛЕЙ**. З завоблачных вышынь давядзецца спусціцца хоць бы на адну прыступку. Чым бліжэй да зямных спраў будзеце, тым больш шанцаў на поспех у рэальнасці, а не ў уяўленні. Паменш думайце пра этыку, мараль, прыстойнасці — і пабольш пра практычнасць тых ці іншых дзеянняў. У панядзелак не варта прымаць актыўную пазіцыю ў спрэчцы, лепш наогул пастарацца ў ёй не ўдзельнічаць. У чацвер не пазбягайце зносінаў, бо ўсе кантакты будуць спрыяльныя для вас. У пятніцу можа ажыццявіцца ваша даўняе жаданне. У суботу добра будуць удавацца спантанныя дзеянні — у гэты дзень можна паддацца раптоўнаму парыву і дзейнічаць інстынктыўна. Пазбягайце дзеянняў з альтруістычных намераў — дзякуй вам не скажуць.

**РЫБЫ**. На гэтым тыдні можна чакаць поспехаў у прафесійнай галіне. Адзіная перасцярога: старайцеся пазбягаць дыктатарскіх замашак і ўспрымайце спакойна парады навакольных людзей. Самым складаным днём тыдня будзе панядзелак: каб больш эканомна расходаваць свае сілы і нервы, варта сканцэнтравацца на якойсьці адной, найбольш неадкладнай задачы. Прысвяціце другую палову тыдня знаёмству і ўстанаўленню адносінаў з уплывовымі людзьмі. Далейшыя зносіны з імі дазволяць умацаваць ваша становішча на рабоце і адкрыюць для вас новыя магчымасці.

## «МЕТАЛІЧНЫЯ ІДЭІ» Ў МІНСКУ

**Днямі ў Мінску, у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі (вул. Карла Маркса, 12), адкрылася выстава «Металічны вернісаж». Свае творы выстаўляюць вядомыя кавалі Беларусі, Расіі, Літвы і Украіны.**

Падсвечнікі, камінныя наборы, прадметы інтэр'еру, зброя і даспехі, мэбля, элементы архітэктурнага і ландшафтнага дэкору і яшчэ шмат цікавага можна ўбачыць на гэтай выставе. Сёння стала вельмі папулярным выкарыстоўваць такія вырабы ў дэкоры інтэр'ераў не толькі вялікіх катэджаў, але і звычайных кватэр.

— Справа ў тым, што сучасны чалавек хоча ўкладаць свае грошы ў «сур'ёзныя рэчы», — патлумачыў цікавасць да твораў з металу, якая апошнім часам імкліва ўзрастае, вядомы беларускі каваль Аляксандр Міхалевіч. — Каваныя вырабы амаль што вечныя, а калі яшчэ такая рэч з'яўляецца мастацкім творам, то яе не сорамна будзе і дзецям перадаць, а можа і ўвогуле прадаць, бо кошт любых мастацкіх твораў з цягам часу павялічваецца.

Канешне, размова ідзе не пра фабрычныя вырабы, а пра аўтарскія каваныя творы. Мастак прызнаўся, што пакуль ў Беларусі больш распаўсюджаныя прамысловыя вырабы з металу, але ў хуткім часе сітуацыя зменіцца, бо таленавітых мастакоў кавальскай справы ў нашай краіне становіцца ўсё больш. Упэўніцца ў гэтым можна на выставе, убачыўшы работы беларускіх кавалёў Юрыя Крушы, Юрася Мацко, Зігмунда Сабко і Юрыя Фурса.

Выстава «Металічны вернісаж» будзе працаваць да 20 лютага.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Прэм'ера

# ІВАНАЎ ЗАГАВАРЫЎ ПА-БЕЛАРУСКУ...

## У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі чарговая прэм'ера — пастаноўка драмы Антона Чэхава «Іванаў»

**« — Слухай, бедалага… Тлумачыць табе, хто я — сумленны ці подлы, здаровы ці псіхапат, я не буду. Табе не ўдзяўбеш. Быў я маладым, гарачым, шчырым, недурным; любіў, ненавідзеў і верыў не так, як усе, працаваў і спадзяваўся за дзесяцярых, змагаўся з мельніцамі, біўся лбом аб сцены; не суразмерыўшы свае сілы, не разважаючы, не ведаючы жыцця, я ўзваліў на сябе ношку, ад якой адразу ж захрумсцела спіна і пацягнуліся жылы; я спяшаўся выдаткаваць сябе на адну толькі маладосць, п'янеў, узрушаўся, працаваў; не ведаў меры… І скажы: а ці можна было інакш? Нас жа мала, а работы многа, многа! Божа, як многа! І вось як жорстка помсціць мне жыццё, з якім я змагаўся! Надарваўся я! У трыццаць гадоў ужо пахмелле, я стары, я ўжо апрануў халат. З цяжкай галавой, з лянівай душой, стомлены, надарваны, надломлены, без веры, без любові, без мэты, як цень, сланяюся я сярод людзей і не ведаю: хто я, навошта жыву, чаго хачу?..».**

... Прачытаеш такое, і здрыганецца сэрца, перахопіць дыханне. А пачуеш з вуснаў выдатных майстроў беларускага нацыянальнага мастацтва, пачуеш у «дзеянні» з тэатральнай сцэны — і наогул хочацца ...плакаць. Не ад сентыментальнасці сваёй душы, не ад яе чуллівасці... І нават не ад спагады да галоўнай дзеючай асобы... «Загінуў беззваротна! — крычыць герой са сцэны. — Перад табой стаіць чалавек, у трыццаць пяць гадоў ужо стомлены, расчараваны, раздаўлены сваімі нікчэмнымі подзвігамі; ён згарае ад сораму, здзекуецца над сваёй слабасцю... О, як узбунтоўваецца ўва мне гордасць, якое душыць мяне шаленства...».

Вялікім ён быў Майстрам псіхалагічнага аналізу стану душы чалавека, гэты Антон Паўлавіч Чэхаў(!). Настолькі вялікім і непараўнальным, што і сёння, праз не адно дзесяцігоддзе, яго героі не проста жывуць, але і прымушаюць да дзеянняў, дзейснасці, высноў...

Драме «Іванаў» — 118 гадоў. Аднак, нягледзячы на такі «паважаны» ўзрост твора, да яго пастаноўкі звярталіся вельмі і вельмі нямногія калектывы. Так, былі падчас напісання твора і гучныя, з сапраўдным звонам, прэм'еры, і шумныя рэкламныя публікацыі, аднак... Ці то сам час, а, хутчэй за ўсё, больш таленавітыя і адпаведныя «той» эпосе і «таму» грамадству іншыя творы Антона Паўлавіча (тыя ж «Чайка», «Тры сястры», «Вішнёвы сад», «Дзядзька Ваня»), «зацмілі» ягоныя ж, роздумныя і разважлівыя, больш таго — зарыентаваныя на далёкую будучыню, якой, дзякуй богу, стаў ужо наш час, п'есы.

Добра, што, хоць і надоўга, але ж — не назаўсёды!

...Адважыўшыся на пастаноўку чэхаўскага «Іванава», Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі «абазначыў» твор як адну з самых неадназначных п'ес класіка. І не без падстаў на тое... Бо ўжо тады, адразу пасля апублікавання і першай пастаноўкі яе, п'еса выклікала шумную палеміку і «возбудила разноречивые толки и мнения». Ужо ў маі 1889 года вядомы крытык А. Пляшчэеў паведамляў пісьменніку В. Караленку: «Одни превозносят пьесу до небес, другие страшно ругают...» Твор маладога драматурга А. Чэхава знішчалі як бяздарны такія вядомыя «ценители», як Г. Успенскі, М. Міхайлоўскі, той жа В. Караленка, шматлікія ананімныя аўтары «рэцэнзій» і «водгукаў»... М. Міхайлоўскі ў сваіх «Случайных заметках» так і адзначыў: Чэхаў, «будучи очень талантливым молодым писателем, написал плохую драму...».

Аднак жа былі і іншыя, куды больш рэальныя і аб'ектыўныя ацэнкі твора. Аглядальнік «Недели» Р. Дзістрэла паставіў Іванава «в ряды «героев времени», в ряды Онегиных, Печориных, Бельтовых и Рудиных...». Ён адназначна напісаў, што гэты вобраз з'яўляецца «лучшим выражением господствующего среди нас настроения и дает нам право причислить г. Чехова к тем художникам, которые умели схватывать и изображать внутреннюю физиономию сменяющихся поколений...».

Думаецца, лепш пра твор і не скажаш!

— Вялікая, шматузроўневая работа над драмай пачалася з перакладу яе на беларускую мову, — гаворыць мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта рэспублікі «За духоўнае адраджэнне» прафесар Валерый Анісенка. — Гэту справу мы папрасілі зрабіць Уладзіміра Максімавіча Скарынкіна — аднаго з найбольш вядомых і таленавітых сучасных творцаў беларускай літаратуры, вядомых сваімі класічнымі перакладамі не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі, у прыватнасці, у Італіі, дзе некалькі гадоў таму ён быў высока ўганараваны за пераклад на беларускую мову бессмяротнага Дантэ. І наогул да працы з беларускамоўным тэкстам драмы Чэхава мы падышлі з усёй адказнасцю. Кансультантам па мове, напрыклад, запрасілі выдатнага спецыяліста сцэнічнага маўлення прафесара Ілью Кургана, музычнае афармленне з ахвотай пагадзіўся выканаць кампазітар Уладзімір Кандрусевіч... Ну а тое, як «зрабілі» сваю справу выканаўцы роляў, меркаваць, як кажуць у такіх выпадках, не нам, а гледачам — самым галоўным і аб'ектыўным суддзям кожнай творчай справы...

Не ўдаючыся ў падрабязнасці, у так званы прафесійны разбор зробленай справы (яшчэ раз зазначу: справы такой шматабдымнай, працаёмістай, але ж — патрэбнай і, несумненна, удзячнай!) адзначу: чэхаўскі «Іванаў» набыў новае, і не толькі сцэнічнае, увасабленне і жыццё. Трэба бачыць, як самаададдана і ўпэўнена, шчыра і з вялікім мастакоўскім задавальненнем выконваюць «свае» ролі вядомыя майстры сцэны: Ігар Сігаў і Людміла Сідаркевіч, заслужаная артыстка рэспублікі Таццяна Мархель і Максім Панімачанка, Галіна Чарнабаева і Валерый Ласоўскі, Андрэй Дабравольскі і Ганна Арыніч-Анісенка... Зусім не «губляюцца», а, хутчэй за ўсё, наадварот — уносяць свежыя і новыя выканаўчыя матывы і ноткі ў пастаноўку чэхаўскай драмы, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры Андрэй Шылько (выканаўца адной з вядучых роляў — маладога земскага ўрача Яўгена Львова), Вольга Бухта, Марыя Пятровіч — між іншым, выхаванцы Валерыя Анісенкі, прафесара гэтай вышэйшай навучальнай установы Беларусі.

Пастаноўкай «Іванава» Антона Чэхава Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі зноў засведчыў, што з'яўляецца сапраўднай лабараторыяй такой жа сапраўднай драматургічнай творчасці. Акцёры ў чарговы раз прадэманстравалі, што для іх высокае мастацтва — зусім не перашкода, а новы, чарговы крок да сапраўднага таленавітага майстэрства.

**Анатоль МЯСНІКОЎ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БАЦЬКОЎСКІЯ КЛОПАТЫ

## Мароз: сябар ці вораг

**Нарэшце і да нас завітала сапраўдная зіма са снегам і марозам. Аднак да ўсеагульнай радасці прыбавілася і адчуванне трывогі, асабліва ў бацькоў, бо халадовыя траўмы — самыя распаўсюджаныя ў гэту пару года сярод дзяцей. І справа тут нават не ў марозным надвор'і, а ў асаблівасцях арганізма дзіцяці, якое можа абмарозіцца і пры нулявой тэмпературы.**

### І снег, і вецер, і... дыятэз



Вядома, само па сабе халоднае надвор'е не нагода, каб не выпускаць дзіця на вуліцу. Аднак неабходна мець на ўвазе, што менавіта зімой працяглыя прагулкі часта суправаджаюцца пераахаладжэннем. Пры моцным ветры з высокай вільготнасцю паветра прамачыць адзенне і абутак вельмі проста. А яшчэ неабходна ўлічваць і агульны стан здароўя дзіцяці. Калі яно стомлена школьнымі нагрузкамі ці перанесла нейкую хваробу, яго арганізм не зможа актыўна супраціўляцца холаду. А калі ў яго яшчэ ёсць і хранічныя скурныя захворванні, то яно ўдвайне схільнае да абмаражэння.

### Адрознівайце насы па колеру

Напрыклад, вы бачыце, што ваша дзіця жвава гуляе, у яго румяны тварык. Хваляваца няма аб чым. Пачырваненне скуры сведчыць, што арганізм сам сябе абараняе: сасуды расшырыліся, і ўзмацніўся прыток крыві да тканак. Але калі вы заўважылі, што тварык пабялеў, — гэта першая прымета абмаражэння: сасуды звузіліся, і ахоўныя сілы арганізма згасаюць. Пры гэтым важна памятаць, што самі дзеці дрэнна кантралююць свой фізічны стан, таму праз пэўны час у іх могуць быць пашкоджаныя глыбокія тканкі рук, ног, твару. Запомніце асноўныя сімптомы халадовых пашкоджанняў, каб, пры неабходнасці, правільна аказаць дапамогу.

**Пераахаладжэнне.** Скура пабялела і анямела, аднак навобмацак застаецца мяккай і эластычнай.

**Дрыжыкі з пачырваненнем скуры.** Скура пачырванела і прыпухла, але застаецца мяккай.

**Абмаражэнне.** Скура набыла васковае ці сіняватае адценне. Пры далейшым уздзеянні холаду яна робіцца цвёрдай. Затым гэты ўчастак набудзе шэры колер і апухне.

### Дапамагаючы, не нарабіце шкоды

Калі вы заўважылі якія-небудзь з пералічаных сімптомаў, неадкладна прымайце меры. Пры гэтым пазбягайце распаўсюджаных памылак.

1. Не прымушайце дзіця энергічна рухацца, каб сагрэцца. Гэта справе не дапаможа, аднак можа прычыніць боль.

2. Не расцірайце пашкоджаныя ўчасткі рукамі, рукавічкамі, а тым больш снегам. Ад гэтага скура траўміруецца і можна занесці інфекцыю.

3. Не саграваце дзіця пры дапамозе гарачай грэлкі, ля батарэі ці печкі. Паколькі скура страціла адчувальнасць, яе лёгка апячы.

### Што раіць доктар

Калі абмарозіліся нос, шчокі ці кончыкі вушэй, асцярожна разатрыце гэтыя ўчасткі тампонам, намочаным спіртам ці гарэлкай.

А самы эфектыўны сродак для аднаўлення кровазвароту ў тканках — цёплая ванна. Пачынаць трэба з тэмпературы 36—37°, затым паступова давесці яе да 40° . Ванну трэба прымаць не менш чым паўгадзіны, асцярожна падліваючы гарачую ваду. Як толькі скура пачырванее і, на жаль, з'явіцца боль, прама ў вадзе можна зрабіць лёгкі масаж, а пасля ванны на пашкоджаныя ўчасткі налажыць павязкі з марлі і тоўстага слою ваты, якія зверху накрыць цэлафанам. Пакуль дзіця адаграваецца ў ванне, дайце яму шклянку моцнага, цёплага, салодкага чаю.

**Увага! Калі на працягу 10—20 хвілін цеплавая працэдура не дала выніку, выклікайце «хуткую дапамогу».**

-2384-

### З марозам на «ты»

Было б лепш, калі б вам ніколі не давялося прымяняць свае веды аб першай дапамозе пры абмаражэнні. Таму пастарайцеся папярэдзіць зімовыя непрыемнасці з дзецьмі.

❄ Выпраўляючы дзіця на вуліцу, апранайце яго па прынцыпу капусты: майка, кашуля, лёгкі світэр, цёплы світэр... Паміж імі застаюцца паветраныя праслойкі, якія добра захоўваюць цяпло.

❄ Верхняе адзенне павінна быць непрамакальным.

❄ У чаравікі пакладзіце цёплыя вусцілкі, шкарпэтак павінна быць двое — баваўняныя і шарсцяныя.

❄ Перавагу аддавайце рукавічкам, пакрытым воданепранікальнай тканінай. Яны лепшыя за пальчаткі, няхай нават футравыя.

❄ Перад выхадам на вуліцу добра накарміце дзіця, а калі мяркуецца працяглая прагулка, вазьміце з сабой тэрмас з гарачым чаем, а таксама запасныя шкарпэткі і рукавічкі.

РУКАДЗЕЛЛЕ

## Сунічная паляна



**Часу на вышыванку, узор якой прапануем вашай увазе, спатрэбіцца роўна столькі, колькі вы самі захочаце ўдзяліць гэтаму прыемнаму занятку. Затое потым, у любы сезон, у любое надвор'е, у вас у доме з'явіцца свая ўласная «сунічная паляна», якая будзе нагадваць аб цёплым сонечным леце.**

Вышыванка наша, можна сказаць, «безразмерная»: хочаце — раскіньце на беласнежным полі 3—4 яркія ягады — атрымаецца стыльна і элегантна. Хочаце — усейце ўсю «паляну» сакавітымі суніцамі, быццам рассыпалі цэлы кошык — таксама будзе вельмі прыгожа, весела, нават апетытна. Не толькі колькасць матываў лёгка мяняць па свайму жаданню, але і памеры работы: у залежнасці ад выбранага маштабу гэтыя ўзоры можна скарыстаць для такіх розных па велічыні вырабаў, як настольнік, сурвэтка, навалачка для падушкі, мяшочак для хлеба і г.д.

***Для работы вам спатрэбяцца:*** белая тканіна буйнога пляцення ці канва (дэталі для будучага вырабу выражце з прыпускам на швы, зрэзы апрацуйце), пяльцы, ніткі мулінэ чырвонага, зялёнага, цёмна-зялёнага і чорнага колераў у два складанні.



Дакладна па схеме размясціце малюнак і пачынайце вышыванне. Калі работа будзе зроблена, старанна адпрасуйце вышытыя дэталі праз вільготную тканіну, дайце высахнуць, пасля чаго злучыце іх, калі планавалі зрабіць чахол, навалачку, ці апрацуйце краі, калі вышывалі настольнік, сурвэтку.

-2385-

# СКАНВОРД

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**<u>Сканворд (31 студзеня).</u> <u>Па гарызанталі:</u> Заваратнюк. Ікра. Араб. Пат. Этна. Міска. Порт. Цяга. Пра. Смерч. Алфёраў. Аўт. Якар. Чака. Мадам. Вадалаз. Лавелас. Піка. Юта. Ніва. Мір. Кальмар. Куст. Рака. Ушу. Ліманад. Ара. Ракаў. <u>Па вертыкалі:</u> Прагал. Віск. Грыф. Смак. Адамс. Праўда. Італія. Тураў. Алюр. Заір. Аўтамат. Рымар. Капа. Зара. Вярба. Кунак. Тля. Кашара. Удаў. Маса. Ячмень. Сцежка. «ЛІМ». Актава. Віза. Чара. Саркафаг.**

## ЗВЯЗДОЎЦЫ РАДЫ ПАВЕДАМІЦЬ



аб чарговым поспеху на ніве ўзятага курсу на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне — у нашай супрацоўніцы **Алены ГІЛЕП** нарадзіўся першынец! З чым шчыра віншуем маладых бацькоў, жадаем усёй сям'і, а найперш маме і немаўлятку моцнага здароўя, шчаслівага лёсу, цеплыні і любові ў іх новым доме, новых радасцяў і знаходак у генеральным накірунку (чытай пачатак).



## УСМІХНЁМСЯ!

Міліцыянер злавіў у заапарку п'янага.

— Піў?

— Не.

— Праверым. Хто там у клетцы сядзіць? — паказвае на кенгуру.

Мужык тупа глядзіць на жывёлу:

— Заяц... Гадоў 40—45...

☺

**Жаніцьба — гэта працэс падання мужчыны ў пяшчотныя жаночыя лапы.**

☺

— Ты выйдзеш за мяне?

— Не.

— Ну, выйдзі за мяне!

— Я падумаю.

— Ну, выйдзі ж за мяне!!

— Ну, добра.

— У камандзе «Дынама» (Кіеў) замена: замест Андрэя Гусіна выходзіць Аляксандр Галаўко.

☺

**Дрэнны ўчынак — добры прыклад...**

☺

Ідуць двое па могілках, чытаюць надпісы на помніках. Адзін:

— «Джон Сміт, адвакат і добры чалавек».

Другі:

— Гэта ж трэба, двух чалавек у адну магілу запіхалі!

*Віншуем з юбілеем нашу калегу **Ірыну Іванаўну БЫЧКОЎСКУЮ** -- вельмі патрэбную супрацоўніцу і вельмі прыгожую жанчыну з юбілеем.*



*Жадаем здароўя -- яго часта не хапае,*
*Весялосці жадаем --*
*яна ніколі не перашкаджае,*
*Удачы жадаем -- яна прыходзіць нячаста,*
*І проста жадаем*
*вялізнага асабістага шчасця.*
*Давайце часцей сустракацца!*

**Звяздоўцы.**

В извещение о проведении аукциона по продаже автомобилей, станка и сварочных трансформаторов опубликованное 30.01.2007 г. газете «Звязда» вносится поправка: аукцион состоится 14.02.2007 г. и документы принимаются по 13.02.2007 г.

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.54 | 16.54 | 9.00 |
| Віцебск — | 7.48 | 16.39 | 8.51 |
| Магілёў — | 7.44 | 16.44 | 9.00 |
| Гомель — | 7.35 | 16.45 | 9.10 |
| Гродна — | 8.08 | 17.10 | 9.02 |
| Брэст — | 8.03 | 17.16 | 9.13 |

**Месяц**

***Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Агнії, Валер'яна, Ілы, Максіма, Яўгена.* ***К.*** *Яны, Блажэя, Іпаліта.*

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +2 — +4 °C | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | -3 — -1 °C | Без ападкаў |
| КІЕЎ | -1 — +1 °C | |
| МАСКВА | -5 — -3 °C | Без ападкаў |
| РЫГА | 0 — +2 °C | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | -7 — -5 °C | |

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

**ФОТАСЛОВА**



*Нябёсы адлюстроўваюцца*
*ў росах.*
*І зоркі падаюць*
*нячутна на раллю —*
*У вечнай повязі*
*планета і нябёсы:*
*Глядзіце ў высі з марай пра зямлю,*
*Глядзіце з-пад далоні, у тэлескопы,*
*З касмічных караблёў,*
*са сцежак ў жыцце,*
*З вышыняў гор,*
*са дна сырых акопаў —*
*З надзеямі на лепшае — глядзіце.*
*І вы аднойчы ўбачыце здалёку*
*У бездані валошкавых нябёс,*
*Як раніцай ляціць па небу зорка,*
*Ў адзінае звязаўшы час і лёс.*

## 3 лютага

*Дзве даты*



**1127 год** — у Лаўрэнцеўскім летапісе ўпершыню згадваецца старажытны горад Полацкай зямлі Некалач: «Новгородци подоша со Мстиславичем со Всеволодом ко Неколочю». На сёння месцазнаходжанне старажытнага і багатага горада не вызначана. Ёсць меркаванне, што яго рэшткі могуць знаходзіцца каля возера Некалач, пад Пінскам, адкуль бярэ пачатак рака Палата. На возеры з такой жа назвай у Лепельскім раёне каля вёскі Бор рэшткаў старажытнага горада не знойдзена.

**1919 год** — прынята першая Канстытуцыя Беларусі.

*Цытата дня:*

***«Дружба — гэта такое святое, непарушнае, пастаяннае пачуццё, што яго можна захаваць на ўсё жыццё, калі, вядома, не пазычаць грошай».***

**Марк Твен (1835—1910), амерыканскі пісьменнік.**

Нядаўна ў польскім горадзе Познань завяршыўся міжнародны будаўнічы кірмаш «Budma-2007», у рамках якога Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і работадаўцаў падпісаў Дагавор аб стратэгічным партнёрстве з «Міжнароднымі Познаньскімі кірмашамі» да 2009 года.

Дзякуючы гэтаму дакументу грамадскае аб'яднанне мінскіх прадпрымальнікаў зможа сур'ёзна пашырыць сваю прысутнасць на большасці дзелавых форумаў, якія праводзяцца ў Познані — прызнанай сталіцы кірмашоў Польшчы.

Дастаткова сказаць, што на ўжо згаданым кірмашы «Budma-2007» пабывала не менш як 170 прадстаўнікоў беларускай будаўнічай галіны, 40 з якіх увайшлі ў афіцыйную дэлегацыю Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў.

**Барыс ЗАЛЕСКІ, дырэктар РІА «Міжнародны клуб».**

## ДАГАВОР АБ СТРАТЭГІЧНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ

## Міжнародны клуб ЗВЯЗДА

## НАШЫ ПАРТНЁРЫ — МАЛДОВА І ПОЛЬШЧА

Работа в Польше

Огородное хозяйство примет на работу женщину для сезонной работы в оранжерее.

Дополнительная информация по телефону: (8-10-48-662) 379-860, с 18 до 21 часа.

После получения телефона для контакта через SMS, e-mail или почтой обязательно свяжемся

Наш адрес: Огородное хозяйство -- "TOMATO JTM"
Janow 14, 05-480 Karczew, Polska / Польша.
E-mail:info@tomatojtm.pl Http://www.tomatojtm.pl
Факс: 8-10-48-7808408.

Работаем через агентства Беларуси соответствующего профиля, имеющие необходимые разрешения и лицензии.

Кишиневская трикотажная фабрика А.О. "Dalia"



заинтересована в совместном с белорусскими предпринимателями производстве трикотажных изделий (свитеров, пуловеров, жакетов, костюмов для детей, женщин и мужчин) из пряжи производства ОАО "Камвольно-прядильная фабрика" г. Слоним.

Республика Молдова, г. Кишинев
Тел.: (8-10-37322) 553396. Факс: (8-10-37322) 553397.
Моб.: (8-10-373) 691 70985.
E-mail: dalia-2006@inbox.ru www.daliamoldova.com

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ ВЫИГРАЙ С VESTEL

1. Организатором рекламной игры «Выиграй с «Vestel» (далее «Игра») является Общество с ограниченной ответственностью «ХОЛСТИН», Республика Беларусь, 220125, г. Минск, ул. Острошицкая, д.12, оф.2, ком.2, зарегистрированное решением Минского горисполкома от 21.06.2001 № 769 в ЕГР за № 101020980

УНН 101020980

2. Наименование рекламной игры: «Выиграй с «Vestel».

3. Место (территория) проведения рекламной игры: Республика Беларусь.

4. Начало рекламной игры: 06.02.2007 года.

Окончание рекламной игры: 16.04.2007 года.

5. Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры.

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению рекламной игры (далее «Комиссия») в составе 4 (четырех) человек. Комиссия осуществляет свою деятельность в соответствии с зарегистрированными в установленном порядке правилами Игры:

- рассматривает высланные участниками Игры анкеты на предмет соответствия требованиям настоящих правил;

- определяет обладателей призов на основании проведенного розыгрыша;

- рассматривает спорные вопросы при проведении рекламной игры и розыгрыше призового фонда.

Заседания Комиссии проводятся по мере необходимости. Дата, время заседания комиссии, а также повестка дня утверждается Председателем Комиссии в соответствии с Правилами игры. О дате и времени заседания Комиссии членов уведомляет секретарь Комиссии.

Ведет заседания Комиссии Председатель, обеспечивая объективность рассмотрения вопросов, входящих в повестку дня. В отсутствие на заседании Председателя Комиссии, его обязанности исполняет один из членов Комиссии, назначенный Председателем Комиссии. Заседания Комиссии правомочны при наличии большинства членов зарегистрированного ее состава. Все решения Комиссией принимаются путем открытого голосования простым большинством голосов присутствующих на заседании членов комиссии. В случае равенства голосов «за» и «против» принятия решения голос Председателя Комиссии или члена комиссии, исполняющего его обязанности, является решающим.

Решения Комиссии оформляются протоколом, который должен быть подписан всеми присутствующими на заседании членами Комиссии.

В случае возникновения спорных ситуаций окончательное решение принимает Комиссия по проведению рекламной игры.

6. Условия участия в игре.

Участниками игры могут стать совершеннолетние граждане Республики Беларусь, которые приобрели стиральную машину «Vestel» в местах их розничной продажи.

7. Порядок отбора участников рекламной игры.

Лица, отвечающие требованиям условий участия в игре, с 06.02.2007 по 05.04.2007 включительно должны совершить покупку стиральной машины «Vestel» любой модели в местах их розничной продажи в срок до 05.04.2007. Каждый участник рекламной игры заполняет и высылает анкету, прилагаемую к стиральной машине «Vestel», в адрес ООО «ХОЛСТИН»: 220125 г. Минск, ул. Острошицкая, д.12, оф,2, ком.2.

Покупатели, приобретшие стиральные машины до начала рекламной игры (но не ранее 01 ноября 2006 года), могут обратиться по месту приобретения стиральной машины для получения анкеты, эти анкеты также принимают участие в розыгрыше.

В розыгрыше принимают участие письма, полученные до 15.04.2007 включительно (по почтовому штемпелю получения).

В анкете должны быть обязательно заполнены все пункты. Анкета с незаполненными пунктами к участию в розыгрыше рекламных призов не допускается.

8. Призовой фонд формируется организатором до начала игры за счет чистой прибыли и включает в себя 3 (три) приза:

| Наименование | кол-во | цена за ед. | сумма |
|---|---|---|---|
| Фотоаппарат SONY Cyber-Shot DSC-W40, с картой памяти 512 Mb Pro Duo Sandisk Memorystick | 1 | 681 600 | 681 600 |
| Музыкальный центр PHILIPS FWM 372/12 | 1 | 520 675 | 520 675 |
| Телевизор PHILIPS 21PT512/60 | 1 | 538 788 | 538 788 |
| ИТОГО | 3 | x | 1741 063 |

Общий размер призового фонда: 1741063 (один миллион семьсот сорок одна тысяча шестьдесят три) руб.

Розыгрыш призов рекламной игры состоится в 12 часов 16.04.2007 в офисе ООО «ХОЛСТИН» по адресу: г. Минск, ул. Острошицкая, д.12, оф.2, ком.2.

9. Обладателями призов станут три участника рекламной игры, определенных посредством вытягивания из барабана писем. Все письма будут находиться в барабане, далее последовательно будут разыграны призы (вначале фотоаппарат с картой памяти, затем музыкальный центр, затем телевизор). Вытягивать выигравшие письма будет член комиссии. Причем перед началом розыгрыша и после каждого разыгранного приза барабан будет вращаться.

Организатор рекламной игры в срок до 30.04.2007г. (включительно) уведомляет победителей заказным письмом о месте, сроках и дате выдачи призов.

10. Место, порядок и срок выдачи призов.

Вручение призов будет производиться с 17.04.2007 по 31.05.2007 (включительно):

- в офисе ООО «ХОЛСТИН» по адресу: г. Минск, ул. Острошицкая,12, оф.2. — с 10:00 до 17:00 ежедневно (кроме праздничных и выходных дней) при наличии паспорта или иного документа, удостоверяющего личность;

- в случае письменной просьбы победителя — выдача приза будет производиться в месте приобретения стиральной машины «Vestel», но не ранее 14 календарных дней с момента обращения.

Победители рекламной игры несут ответственность за соблюдение ими действующего законодательства в сфере налогообложения.

Денежный эквивалент призов не выплачивается.

11. Настоящие правила, состав комиссии по ее проведению, размер и состав призового фонда подлежат опубликованию в периодическом печатном издании до начала рекламной игры. Результаты розыгрыша призов рекламной игры публикуются с 17.04.2007 по 30.04.2007 в том же печатном издании.

Телефоны для справок: (+375 17)283-75-22, 289-61-16 с 10:00 до 17:00 ежедневно (кроме праздничных и выходных дней).

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

<u>НАШ АДРАС</u>: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

**html:** www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 672. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**